Весці БДПУ. Серыя 1. 2017. № 3. С. 96–100.

УДК 81'42:81'36

# РОЛЯ ГРАМАТЫЧНЫХ КАТЭГОРЫЙ У ПАБУДОВЕ ДЫСКУРС-КАРЦІН СВЕТУ І КАРТЭЖНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

**К. М. Васіленка,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін МІ МУС Рэспублікі Беларусь*

Паступіў у рэдакцыю 11.07.17.

UDC 81'42:81'36

# THE ROLE OF GRAMMATICAL CATEGORIES IN CREATING DISCOURSE PICTURES OF THE WORLD AND CORTEGE INTERACTION

**E. Vasilenko,**
*Candidate of Philology, Associate Professor of the Department of Social Sciences and Humanities, MI MIA RB*

Received on 11.07.17.

Артыкул прысвечаны выяўленню прагматычнага патэнцыялу граматычных катэгорый. Аўтарам разглядаюцца разнастайныя падыходы да існасці прагматыкі. Акрэсліваецца праблемнае поле прагмалінгвістыкі як адносна новай галіны лінгвістычных даследаванняў. Асобая ўвага звяртаецца на катэгорыю суб'ектыўнасці як камунікатыўную рэалізацыю агульнай антрапацэнтрычнай устаноўкі мовы і марфалагічную катэгорыю асобы як ядра функцыянальна-семантычнага поля персанальнасці. Катэгорыя асобы апісваецца з пункту погляду прагматыкі ва ўзаемасувязі з граматычнымі катэгорыямі часу і ладу, якія з'яўляюцца ядрамі адпаведных функцыянальна-семантычных палёў тэмпаральнасці і мадальнасці. Адлюстроўваецца роля дазеных граматычных катэгорый у рэалізацыі камунікатыўных стратэгій моўцы. Аўтар прыходзіць да высновы, што граматычныя катэгорыі асобы, часу і ладу з'яўляюцца важнымі сродкамі стварэння моўцай дыскурс-карцін свету і картэжнага ўзаемадзеяння.

*Ключавыя словы:* граматычныя катэгорыі, прагматыка, дыскурс-карціна свету, дыскурс-карціна картэжнага ўзаемадзеяння.

The article is devoted to the determination of the pragmatical potential of grammatical categories. The author reviews the variety of existing approaches to the essence of pragmatics. The problem field of pragmalinguistics as a relatively new branch of linguistic research is outlined. Special attention is paid to the category of subjectivity as a communicative realization of the general anthropocentric nature of language and to the morphological category of person as the nucleus of the functional-semantic field of personality. The category of person is described in the light of pragmatics in its interconnection with the grammatical categories of tense and mood being the nuclei of the corresponding functional-semantic fields of temporality and modality. The role of the given grammatical categories in the realization of the speaker's communicative strategies is revealed. The author comes to the conclusion that grammatical categories of person, tense and mood are important means of creating discourse pictures of the world and cortege interaction.

*Keywords:* grammatical categories, pragmatics, discourse picture of the world, discourse picture of cortege interaction.

Традыцыйна ў моваазнаўстве вылучаюцца тры навуковыя парадыгмы – параўнальна-гістарычная, сістэмна-структурная і антрапацэнтрычная [1, с. 38]. Пераход да апошняй пачаўся прыблізна ў 70-х гг. XX ст., калі інтарэс даследчыкаў пераключыўся з аб'екта пазнання, г. зн. з пытанняў функцыянавання моўных адзінак, на суб'ект пазнання, а менавіта на моўную асобу, г. зн. на чалавека, «які існуе ў моўнай прасторы – у камунікацыі, у стэрэатыпах паводзін, зафіксаваных у мове, у значэннях моўных адзінак і сэнсах тэкстаў» [2, с. 7]. У Ю. С. Сцяпанава знаходзім: «новая парадыгма <…> паставіла ў цэнтр увагі каардынату "Я", разглядаючы яе як неабходную аснову для ўсяго астатняга. На каардынаце "Я" грунтуецца аналіз больш агульнага і настолькі ж важнага для гэтай парадыгмы паняцця суб'екта» [3, с. 217] (*тут і далей пераклад наш. – К. В.*).

Адносіны знакаў (у тым ліку моўных) да іх інтэрпрэтатараў уваходзяць у сферу інтарэсаў прагматыкі, якая, як вядома, была вылучана ў канцы 30-х гг. XX ст. Ч. Морысам як адзін з раздзелаў семіётыкі разам з семантыкай, якая вывучае адносіны знакаў да аб'ектаў, і сінтактыкай, якая разглядае адносіны знакаў паміж сабой [4, с. 50].

На сённяшні дзень прагматыка традыцыйна разумеецца як «галіна даследаванняў у семіётыцы і моваазнаўстве, у якой вывучаецца функцыянаванне моўных знакаў у маўленні» [5, с. 389].

Па меркаванні Ю. С. Сцяпанава, менавіта мова «як бы непрыкметна накіроўвае тэарэтычную думку (філосафаў, якія разважаюць пра

мову) і паэтычны парыў (мастакоў слова) папераменна па адной са сваіх восяў – спачатку семантыкі, потым сінтактыкі, і, нарэшце, прагматыкі і, завяршыўшы гэты цыкл, гатова, па спіралі, паўтарыць яго зноў» [3, с. 5].

Узросшы інтарэс лінгвістаў да прагматычных аспектаў камунікацыі прывёў да вылучэння асобнага, адносна новага, кірунку даследаванняў – прагмалінгвістыкі (прагматычнай лінгвістыкі, лінгвістычнай прагматыкі), якая «ўяўляе сабой адзін з напрамкаў у сучаснай прагматыцы і можа трактавацца як лінгвістычны раздзел прагматыкі» [6, с. 50].

Пад прагмалінгвістыкай разумеецца галіна лінгвістычных даследаванняў, аб’ектам якіх з’яўляюцца адносіны паміж моўнымі адзінкамі і ўмовамі іх ужывання ў вызначанай камунікатыўна-прагматычнай прасторы, у якой узаемадзейнічаюць моўца і слухач / чытач і для характарыстыкі якой значны пэўныя ўказанні на месца і час іх маўленчага ўзаемадзеяння, звязаныя з актам камунікацыі мэты і чаканні [7].

У сферу прагмалінгвістыкі трапляе шырокае кола праблем, у тым ліку аналіз відавочных і затоеных мэт выказвання, унутранай устаноўкі моўцы і ахвотнасці слухача «пайсці насустрач» у разуменні сэнсу выказвання; вывучэнне тыпаў камунікатыўных паводзін і г. д. Такім чынам, прагмалінгвістыка звяртае ўвагу як на пазіцыю моўцы (выбар формы), так і на пазіцыю слухача / чытача (інтэрпрэтацыя выказвання) [8, с. 8].

Складанасць і шматмернасць прагматыкі сёння адзначаецца многімі лінгвістамі. Так, Т. В. Булыгіна і А. Д. Шмялёў, падкрэсліваючы, што ў натуральнай мове «анталогія» і «прагматыка» існуюць у непарыўнай сувязі і ўзаемадзеянні, адзначаюць, што «экстралінгвістычная рэальнасць уяўляе сабой свет, узяты ў інтэрпрэтацыі людзьмі, разам з іх адносінамі адзін да аднаго, і ў гэтым сэнсе “анталогія” з’яў, як яна пададзена натуральнай мовай, вызначаецца тым, як людзі, якія выкарыстоўваюць мову, канцэптуалізуюць пазамоўную рэчаіснасць; з іншага боку, усякія маўленчыя хітраспляценні магчымы толькі на фоне некаторага зададзенага спосабу моўнай канцэптуалізацыі свету» [9, с. 7].

Адзначаючы складанасць акрэслення меж прагматыкі, В. В. Хімік прапануе вызначыць яе ядро, цэнтр, якім, на думку навукоўца, з’яўляецца «паняцце моўцы, “я”, і адлюстраванне гэтага “я” ў адзінках мовы і маўлення» [10, с. 3].

Дадзены пункт гледжання падзяляюць і іншыя лінгвісты. Напрыклад, Ю. С. Сцяпанаў адзначае, што ў сферы прагматыкі, дзе мы сутыкаемся з максімальнай умоўнасцю і знакавай «адвольнасцю», «сталым застаецца толькі сам прынцып адносін – арыентацыя на моўцу, і гэта адзіная аб’ектыўнасць, якая дзейнічае у гэтай сферы» [11, с. 244].

Эгацэнтрычнасць чалавечага маўлення адзначаецца шматлікімі даследчыкамі. Так, Дж. Лаянз сцвярджае, што ў тыповай сітуацыі выказвання пры пераходзе ў размове ролі моўцы ад аднаго ўдзельніка да іншага пераключаецца і «цэнтр» дэйктычнай сістэмы [12, с. 275], а В. Г. Гак піша, што «чалавечае маўленне эгацэнтрычна, бо менавіта моўца адлюстроўвае ў сваёй свядомасці адносіны паміж прадметамі рэчаіснасці і кампанентамі маўленчага акта» [13, с. 557]. Падобную думку знаходзім у Б. Гейнэ, які лічыць, што структура мовы з’яўляецца вынікам нашага ўзаемадзеяння са светам вакол нас, а спосаб пабудовы выказванняў і развіцця лінгвістычных катэгорый можна вызначыць па тым, як мы ўспрымаем наша асяроддзе і выкарыстоўваем гэты досвед у камунікацыі [14, с. 1].

Камунікатыўнай рэалізацыяй агульнай антрапацэнтрычнай устаноўкі мовы В. В. Хімік называе катэгорыю суб’ектыўнасці. На думку лінгвіста, эгацэнтрычнасць кожнага асобнага выказвання выяўляецца праз суб’ектыўнае самавыяўленне (міжвольнае або асэнсаванае) моўцы, адносна якога ўсталёўваюцца суб’ектыўныя сэнсы (персанальныя, мадальныя, тэмпаральныя, ацэнкавыя, экспрэсіўныя і г. д.), якія разам складаюць «прагмасемантычнае поле суб’ектыўнасці, куды ўваходзяць рознаўзроўневыя моўныя і пазамоўныя сродкі актуалізацыі “я” праз яго розныя паказчыкі» [10, с. 3]. Семантыка-прагматычнае поле суб’ектыўнасці перакрыжоўваецца з шэрагам функцыянальна-семантычных палей, напрыклад, з мадальнасцю і экспрэсіўнасцю, аднак вядучай зонай праявы суб’ектыўнасці з’яўляецца персанальнасць [10, с. 5].

Далей мы таксама будзем выкарыстоўваць распрацаванае прадстаўнікамі функцыянальнага падыходу (які інтэгруе сродкі ўсіх узроўняў мовы на аснове супольнасці іх функцый) паняцце функцыянальна-семантычных палёў, пад якімі разумеюцца «адзінствы, што маюць функцыянальную аснову» [15, с. 3]. У структуры шматлікіх функцыянальна-семантычных палёў можна вылучыць ядро – тыя цэнтральныя моўныя сродкі, якія з высокай доляй рэгулярнасці выражаюць семантыку дадзенага поля. Часта ядром функцыянальна-семантычных палёў з’яўляюцца граматычныя катэгорыі.

Многія лінгвісты адзначаюць своеасаблівасць граматыкі як сістэмы, а інтарэс навукоўцаў да прагматыкі прывёў да патрэбы асэнсавання граматычных катэгорый у прагматычным аспекце, а менавіта з пункту гледжання камунікатыўнай стратэгіі моўцы. Так, А. С. Іссэрс лічыць, што граматыка, якая з’яўляецца складанай, строга арганізаванай сістэмай, якая развіваецца па сваіх унутраных законах, «праяўляе і рухомасць, і гібкасць, якія дазваляюць моўцу творча выкарыстоўваць рэсурсы марфалогіі, словаўтварэння і сінтаксісу ў адпаведнасці са сваімі камунікатыўнымі мэтамі. Граматычная сістэма мовы валодае значным патэнцыялам маўленчага ўздзеяння» [16, с. 130].

Пры гэтым развіццё сістэмнага падыходу ў сучаснай навуцы запатрабавала вывучэння граматычных катэгорый у іх узаемасувязі, што дазваляе устанавіць «новыя моўныя заканамернасці, якія выяўляюцца ў комплекснай залежнасці функцыянавання адной катэгорыі ад функцыянавання іншай катэгорыі» [17, с. 4].

Улічваючы тое, што агульная антрапацэнтрычная ўстаноўка мовы рэалізуецца, галоўным чынам, праз семантыка-прагматычнае поле суб’ектыўнасці, найважнай зонай праявы якога з’яўляецца персанальнасць, уяўляецца справядлівым пры аналізе моўнага матэрыялу адштурхоўвацца менавіта ад дадзенага функцыянальна-семантычнага поля і граматычнай катэгорыі асобы як яго ядра.

Персанальны дэйксіс функцыянуе ў трохчленнай сістэме, якая адлюстроўвае ўнікальнае дзяленне ўсіх аб’ектаў рэчаіснасці на тры катэгорыі з пункту гледжання чалавека, які пазнае свет: *я – ты – ўсё астатняе.* Пры гэтым абавязковае адрозніванне ў сістэме асабовых займеннікаў 1-й, 2-й і 3-й асобы з’яўляецца абсалютнай універсаліяй [18, с. 253], г. зн. функцыянальна-семантычная катэгорыя персанальнасці мае марфалагічнае праяўленне ва ўсіх мовах свету.

В. У. Мартынаў адзначае: «з катэгорыяй асобы мы пакідаем сферу ўнутрыграматычных адносін і пераходзім у іншую – сферу прасторавай і часавай стратыфікацыі дэнатата сказа адносна моўцы (лакацыю). Калі адзінай дзеяслоўнай катэгорыяй, якая ўдзельнічае ў прэдыкацыі, з’яўляецца катэгорыя стану, то катэгорыя асобы і ўсе астатнія дзеяслоўныя катэгорыі ўдзельнічаюць выключна ў лакацыі» [19, с. 116]. Лакацыя з’яўляецца першасным апаратам прагматыкі, апарат якой, у сваю чаргу, «складаецца з разнастайных знакаў-індэксаў, значэнні і функцыі якіх могуць быць вызначаны толькі ў непасрэдным стасунку да акта маўлення ў момант яго працякання» [11, с. 242–243].

Сапраўды, функцыянальна-семантычнае поле персанальнасці самым непасрэдным чынам звязана з полем тэмпаральнасці, бо менавіта гэтыя катэгорыі суадносяць пэўную сітуацыю з канкрэтным актам маўлення. У Ю. С. Сцяпанава знаходзім: «моўца самім актам свайго сцвярджэння як “Я”, прысвойваючы ў момант маўлення імя “Я”, якое дапускае зменныя рэферэнты, для абазначэння сябе і толькі сябе, тым самым прысвойвае сабе ўсю мову, накладаючы на яе каардынаты таго часу, калі ён размаўляе, г. зн. цяперашняга часу маўлення, таго месца, дзе ён размаўляе, г. зн. месца маўлення, і прымушаючы слухача прыняць гэтыя каардынаты і ўзгадніцца з імі. У сваю чаргу, слухач, які стаў моўцам, прaробіць тую ж самую аперацыю прысваення» [3, с. 224]. Катэгорыя часу з’яўляецца важнай крыніцай дэйктычнасці, таму што яна «ўпісвае» ў дэйктычныя каардынаты практычна ўсе сказы, якія ўжываюцца ў маўленні [20, с. 16; 21, с. 682].

У сваю чаргу, універсальная катэгорыя тэмпаральнасці (ва ўсіх мовах свету можна выявіць пэўную арганізацыю паняцця часу) неразрыўна звязана з катэгорыяй мадальнасці, якая, з пункту гледжання прагматыкі, уяўляецца «не як нейкая семантычная дадзенасць (аспект семантыкі), не як функцыя, якая суправаджае дыктальны змест выказвання (аспект сінтактыкі), а як працэс выбару наяўных у веданні мовы сродкаў, якім кіруе і які ажыццяўляе моўца, модусная аранжыроўка моўцам сваіх маўленчых учынкаў з мэтай рэгулявання ўласных і чужых інтэнцый» [22, с. 69]. З прычыны таго, што лад дзеяслова належыць да асноўных сродкаў выражэння мадальнасці, можна сцвярджаць, што ён прагматычны па самай сваёй прыродзе: нават форма абвеснага ладу напаўняецца праз маўленне рознымі адценнямі: магчымасці, пажаданасці, неабходнасці і г. д. [8, с. 125–126].

Разглядаючы парадыгматычныя сувязі дзеяслоўных граматычных катэгорый трывання, стану, ладу, часу і асобы, Ю. А. Пупынін адзначае, што іх парадыгматычныя і функцыянальныя сувязі цесна ўзаемазлучаны. У прыватнасці, адной з формаў праяўлення сувязей граматычных катэгорый у парадыгматычным аспекце з’яўляецца іх іерархічнасць: «інвентар формаў катэгорыі, якая стаіць на ніжэйшай ступені іерархіі, уваходзіць як складнік у інвентар формаў катэгорыі, якая стаіць на больш высокай ступені іерархіі» [17, с. 7]. Так, усе формы асобы ўваходзяць у склад часу, усе формы часу – у склад ладу, «і толькі формы трывання і стану не складаюць часткі інвентару ў адносінах да якой-небудзь іншай катэгорыі, у тым ліку ў адносінах адзін да аднаго» [17, с. 7].

Улічваючы два названыя вышэй параметры: удзел граматычных катэгорый у лакацыі і іх іерархічныя сувязі – мы прапануем вылучыць у якасці найбольш прагматычна значных універсальныя і ўзаемаабумоўленыя катэгорыі асобы, часу і ладу, якім адпавядаюць функцыянальна-семантычныя палі персанальнасці, тэмпаральнасці і мадальнасці. Функцыянальная значнасць дадзеных катэгорый праяўляецца ў камунікатыўным і сугестыўным аспектах. Іншыя граматычныя катэгорыі, такія як лік, род, склон, стан, ступені параўнання і інш., таксама ўдзельнічаюць у рэалізацыі камунікатыўных стратэгій моўцы і дапамагаюць уздзейнічаць на адрасата, аднак яны менш самастойныя і працуюць у комплексе з пералічанымі вышэй (пра ролю граматычных катэгорый назоўніка ў фарміраванні моўнай карціны свету [23]).

Будучы значнымі ў прагматычным дачыненні, граматычныя катэгорыі з’яўляюцца сродкам рэалізацыі розных камунікатыўных стратэгій і тактык моўцы. Так, напрыклад, у рамках палітычнага дыскурсу прагматычны патэнцыял катэгорыі асобы выяўляецца пры рэалізацыі, галоўным чынам, тактык самапрэзентацыі, кааперацыі,

акцэнтавання, супастаўляльнага аналізу і дыстанцыявання, а катэгорыя часу выкарыстоўваецца для актуалізацыі пераважна тактык супастаўляльнага аналізу, ілюстравання, азначэння перспектывы, абяцання, закліку і кааперацыі. Катэгорыя ладу дазваляе моўцу факусіраваць увагу слухача / чытача на пажаданым і зручным для адрасанта стане рэчаў [24, с. 93–94].

Такім чынам, граматычныя катэгорыі дапамагаюць моўцы сфарміраваць у свядомасці слухача / чытача асаблівую дыскурс-карціну свету і дыскурс-карціну картэжнага ўзаемадзеяння (тэрміны прадстаўнікоў каўзальна-генетычнага падыходу да аналізу дыскурсу [25; 26]).

Пад дыскурс-карцінай свету разумеецца «прадмет-арыентаваны, а дакладней, суб'ект-прадметны змест (іншыя магчымыя назвы – рэферэнтны, тэматычны), які адказвае на пытанні: пра што ідзе дыскурсія і як гэта “пра што” арганізавана тэматычна з улікам развіцця тэм?» [25, с. 21]. Дыскурс-карціна картэжнага ўзаемадзеяння – гэта «суб'ект-арыентаваны, а дакладней, суб'ект-суб'ектны змест, які адказвае на пытанне: хто размаўляе і як гэта ўзаемадзеянне паміж камунікантамі падаецца, інакш кажучы, як дыскурс арганізаваны картэжна, на якую дыскурсную супольнасць дадзены тэкст праецыраваны?» [25, с. 22]. Ключавыя катэгорыі дадзеных відаў зместу – тэма і роля адпаведна – «камунікатыўна зададзеныя ў чатырох вымярэннях: іерархічным і структурным (пазалінгвістычныя параметры зместу), парадыгматычным і сінтагматычным (лінгвістычныя, вербальна рэпрэзентаваныя параметры зместу)» [25, с. 26]. Відавочна, што інтарэс для даследавання прагматычнага патэнцыялу граматычных катэгорый прадстаўляюць апошнія дзве характарыстыкі, таму што менавіта яны дазваляюць устанавіць, якімі моўнымі сродкамі карыстаецца моўца, калі падае інфармацыю, каб уздзейнічаць на слухача / чытача.

Такім чынам, прыходзім да высновы, што граматычныя катэгорыі валодаюць значным прагматычным патэнцыялам, дазваляючы моўцу рэалізоўваць сваю камунікатыўную інтэнцыю. Найбольш значнымі з пункту гледжання прагматыкі з'яўляюцца граматычныя катэгорыі асобы, часу і ладу. Пры гэтым катэгорыя асобы выступае пераважным сродкам фарміравання ў свядомасці слухача / чытача дыскурс-карціны картэжнага ўзаемадзеяння, а катэгорыі часу і ладу – дыскурс-карціны свету з асаблівым уяўленнем рэальнасці.

*Літаратура*

1. *Маслова, В. А.* Лингвокультурология : учеб. пособие / В. А. Маслова. – М. : Издат. центр «Академия», 2001. – 208 с.
2. *Карасик, В. И.* Языковой круг : личность, концепты, дискурс / В. И. Карасик. – Волгоград : Перемена, 2002. – 477 с.
3. *Степанов, Ю. С.* В трехмерном пространстве языка: семиотические проблемы лингвистики, философии, искусства / Ю. С. Степанов ; отв. ред. В. П. Нерознак. – 2-е изд. – М. : Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2010. – 336 с.
4. *Моррис, Ч. У.* Основания теории знаков / Ч. У. Моррис // Семиотика : Антология / сост. Ю. С. Степанов. – 2-е изд., испр. и доп. – М., 2001. – С. 45–97.
5. *Арутюнова, Н. Д.* Прагматика / Н. Д. Арутюнова // Лингвистический энциклопедический словарь / под ред. В. Н. Ярцевой. – М., 1990. – С. 389–390.
6. *Матвеева, Г. Г.* Два направления в современной прагмалингвистике / Г. Г. Матвеева, И. В. Самарина, Л. Н. Селиверстова // Вестн. С.-Петерб. ун-та. Сер. 12. – 2009. – Вып. 1. – Ч. II. – С. 50–57.
7. *Сусов, И. П.* История языкознания : учеб. пособие [Электронный ресурс] / И. П. Сусов. – Тверь, 1999. – Режим доступа: http://www.lib.ru/TEXTBOOKS/yazykoznanie.txt. – Дата доступа: 05.02.2017.
8. *Норман, Б. Ю.* Лингвистическая прагматика (на материале русского и других славянских языков) : курс лекций / Б. Ю. Норман. – Минск : БГУ, 2009. – 183 с.
9. *Булыгина, Т. В.* Языковая концептуализация мира (на материале русской грамматики) / Т. В. Булыгина, А. Д. Шмелев. – М. : Школа «Языки русской культуры», 1997. – 576 с.
10. *Химик, В. В.* Категория субъективности в современном русском языке (эгоцентрический потенциал субъективных компонентов высказывания) : автореф. дис. ... д-ра филол. наук : 10.02.01 / В. В. Химик ; С. Петерб. гос. ун т. – СПб., 1991. – 33 с.
11. *Степанов, Ю. С.* Имена, предикаты, предложения: семиологическая грамматика / Ю. С. Степанов ; под ред. Ю. Н. Караулова. – 5-е изд. – М. : ЛКИ, 2012. – 360 с.
12. *Lyons, J.* Introduction to theoretical linguistics / J. Lyons. – Cambridge : Cambridge Univ. Press, 1968. – 523 p.

*References*

1. *Maslova, V. A.* Lingvokulturologiya : ucheb. posobiye / V. A. Maslova. – M. : Izdat. tsentr “Akadeniya”, 2001. – 208 s.
2. *Karasik, V. I.* Yazykovoy krug : lichnost, kontsepty, diskurs / V. I. Karasik. – Volgograd : Peremena, 2002. – 477 s.
3. *Stepanov, Yu. S.* V tryokhmernom prostranstve yazyka: semioticheskiye problemy lingvistiki, filosofii, iskusstva / Yu. S. Stepanov ; otv. red. V. P. Neroznak. – 2-ye izd. – M. : Knizhnyy dom „LIBROKOM“, 2010. – 336 s.
4. *Morris, Ch. U.* Osnovaniya teorii znakov / Ch. U. Morris // Semiotika : Antologiya / sost. Yu. S. Stepanov. – 2-ye izd., ispr. i dop. – M., 2001. – S. 45-97.
5. *Arutyunova, N. D.* Pragmatika / N. D. Arutyunova // Lingvisticheskiy entsiklopedicheskiy slovar / pod red. V. N. Yartsevoy. – M., 1990. – S. 389-390.
6. *Matveyeva, G. G.* Dva napravleniya v sovremennoy pragmalingvistike / G. G. Matveyeva, I. V. Samarina, L. N. Seliverstova // Vestn. S.-Peterb. un-ta. Ser. 12. – 2009. – Vyp. 1. – Ch. II. – S. 50-57.
7. *Susov, I. P.* Istoriya yazykoznaniya : ucheb. posobiye [Elektronnyy resurs] / I. P. Susov. – Tver, 1999. – Rezhim dostupa: http://www.lib.ru/TEXTBOOKS/yazykoznanie.txt. – Data dostupa: 05.02.2017.
8. *Norman, B. Yu.* Lingvisticheskaya pragmatika (na materiale russkogo i drugikh slavyanskikh yazykov) : kurs lektsiy / B. Yu. Norman. – Minsk : BGU, 2009. – 183 s.
9. *Bulygina, T. V.* Yazykovaya kontseptualizatsiya mira (na materiale russkoy grammatiki) / T. V. Bulygina, A. D. Shmelyov. – M. : Shkola “Yazyki russkoy kultury”, 1997. – 576 s.
10. *Khimik, V. V.* Kategoriya subyektivnosti v sovremennom russkom yazyke (egotsentricheskiy potentsial subyektivnykh komponentov vyskazyvaniya) : avtoref. dis. … d-ra filol. nauk : 10.02.01 / V. V. Khimik ; S.-Peterb. gos. un-t. –SPb., 1991. – 33 s.
11. *Stepanov, Yu. S.* Imena, predikaty, predlozheniya: semiologicheskaya grammatika / Yu. S. Stepanov ; pod red. Yu. N. Karaulova. – 5-ye izd. – M. : LKI, 2012. – 360 s.
12. *Lyons, J.* Introduction to theoretical linguistics / J. Lyons. – Cambridge : Cambridge Univ. Press, 1968. – 523 p.

13. *Гак, В. Г.* Прагматика, узус и грамматика речи / В. Г. Гак // Языковые преобразования / В. Г. Гак. – М. : Школа «Языки русской культуры», 1998. – С. 554–566.
14. *Heine, B.* Cognitive foundations of grammar / B. Heine. – New York, Oxford : Oxford Univ. Press, 1997. – 185 p.
15. Теория функциональной грамматики: Ведение, аспектуальность, временная локализованность, таксис / отв. ред. А. В. Бондарко. – М. : Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2013. – 352 с.
16. *Иссерс, О. С.* Речевое воздействие : учеб. пособие / О. С. Иссерс. – 2-е изд. – М. : Флинта ; Наука, 2011. – 224 с.
17. *Пупынин, Ю. А.* Функциональные аспекты грамматики русского языка: взаимосвязи грамматических категорий : учеб. пособие / Ю. А. Пупынин. – Ленинград : Изд-во Ленингр. орд. Труд. Красн. Знам. гос. пед. ин-та им. А. И. Герцена, 1990. – 80 с.
18. *Мечковская, Н. Б.* Общее языкознание. Структурная и социальная типология языков : учеб. пособие / Н. Б. Мечковская. – 8-е изд. – М. : Флинта : Наука, 2011. – 312 с.
19. *Мартынов, В. В.* Категории языка : семиологический аспект / В. В. Мартынов ; отв. ред. Ю. С. Степанов. – М. : Наука, 1982. – 192 с.
20. *Арутюнова, Н. Д.* Истоки, проблемы и категории прагматики / Н. Д. Арутюнова, Е. В. Падучева // Новое в зарубежной лингвистике / под общ. ред. Е. В. Падучевой. – М. : Прогресс, 1985. – Вып. 16. Лингвистическая прагматика. – С. 3–42.
21. *Lyons, J.* Semantics / J. Lyons. – Cambridge : Cambridge Univ. Press, 1977. – Vol. 2. – 526 p.
22. *Конюшкевич, М. И.* Модальность в свете прагматики / М. И. Конюшкевич // Вопросы функциональной грамматики : сб. науч. тр. – Гродно : Изд-во Гроднен. гос. ун-та, 2000. – Вып. 3. – С. 58–78.
23. *Лукина, Н. Ю.* Роль грамматических средств в формировании языковой картины мира (на материале грамматических категорий имени существительного в русском и английском языках) : дис. … канд. филол. наук : 10.02.19 / Н. Ю. Лукина. – Ярославль, 2003. – 219 л.
24. *Василенко, Е. Н.* Реализация коммуникативной стратегии убеждения средствами грамматических категорий (на материале политического дискурса) : дис. … канд. филол. наук : 10.02.19 / Е. Н. Василенко. – Минск, 2013. – 112 л.
25. *Ухванова-Шмыгова, И. Ф.* Каузально-генетический подход к исследованию политического дискурса / И. Ф. Ухванова-Шмыгова // Методология исследований политического дискурса : Актуальные проблемы содержательного анализа общественно-политических текстов ; под ред. И. Ф. Ухвановой-Шмыговой. – Минск : БГУ, 2009. – Вып. 6. Политическое поле Беларуси глазами дискурс-аналитика. – С. 11–29.
26. *Попова, А. В.* Дискурс-картины мира и кортежного взаимодействия элитарных средств информации / А. В. Попова. – Минск : Изд. центр БГУ, 2008. – 153 с.

13. *Gak, V. G.* Pragmatika, uzus i grammatika rechi / V. G. Gak // Yazykovyye preobrazovaniya / V. G. Gak. – M. : Shkola “Yazyki russkoy kultury”, 1998. – S. 554-566.
14. *Heine, B.* Cognitive foundations of grammar / B. Heine. – New York, Oxford : Oxford Univ. Press, 1997. – 185 p.
15. Tworiya funktsionalnoy grammatiki: Vedeniye, aspektualnost, vremennaya lokalizovannost, taksis / otv. red. A. V. Bondarko. – M. : Knizhnyy dom “LIBROKOM”, 2013. – 352 s.
16. *Issers, O. S.* Rechevoye vozdeystviye : ucheb. posobiye / O. S. Issers. – 2-ye izd. – M. : Flinta ; Nauka, 2011. – 224 s.
17. *Pupynin, Yu. A.* Funktsionalnyye aspekty grammatiki russkogo yazyka: vzaimosvyazi grammaticheskikh kategoriy : ucheb. posobiye / Yu. A. Pupynin. – Leningrad : Izd-vo Leningr. ord. Trud. Krasn. Znam. gos. ped. in-ta im A. I. Gertsena, 1990. – 80 s.
18. *Mechkovskaya, N. B.* Obshcheye yazykoznaniye. Strukturnaya i sotsialnaya tipologiya yazykov : ucheb. posobiye / N. B. Mechkovskaya. – 8-ye izd. – M. : Flinta : Nauka, 2011. – 312 s.
19. *Martynov, V. V.* Kategorii yazyka : semiologicheskiy aspekt / V. V. Martynov ; otv. red. Yu. S. Stepanov. – M. : Nauka, 1982. – 192 s.
20. *Arutyunova, N. D.* Istoki, problemy i kategorii pragmatiki / N. D. Arutyunova, Ye. V. Paducheva // Novoye v zarubezhnoy lingvistike / pod obshch. red. Ye. V. Paduchevoy. – M. : Progress, 1985. – Vyp. 16. Lingvisticheskaya pragmatika. – S. 3-42.
21. *Lyons, J.* Semantics / J. Lyons. – Cambridge : Cambridge Univ. Press, 1977. – Vol. 2. – 526 p.
22. *Konyushkevich, M. I.* Modalnost v svete pragmatiki / M. I. Konyushkevich // Voprosy funktsionalnoy grammatiki : sb. nauch. tr. – Grodno : Izd-vo Grodnen. gos. un-ta, 2000. – Vyp. 3. – S. 58-78.
23. *Lukina, N. Yu.* Rol grammaticheskikh sredstv v formirovanii yazykovoy kartimy mire (na materiale grammaticheskikh kategoriy imeni sushchestvitelnogo v russkom i angliyskom yazykakh) : dis. … kand. filol. nauk : 10.02.19 / N. Yu. Lukina. – Yaroslavl, 2003. – 219 l.
24. *Vasilenko, Ye. N.* Realizatsiya kommunikativnoy strategii ubezhdeniya sredstvami grammaticheskikh kategoriy (na materiale politicheskogo diskursa) : dis. … kand. filol. nauk : 10.02.19 / Ye. N. Vasilenko. – Minsk, 2013. – 112 l.
25. *Ukhvanova-Shmygova, I. F.* Kauzalno-geneticheskiy podkhod k issledovaniyu politicheskogo diskursa / I. F. Ukhvanova-Shmygova // Metodologiya issledovaniy politicheskogo diskursa : Aktualnyye problemy soderzhatelnogo analiza obshchestvenno-politicheskikh tekstov ; pod red. I. F. Ukhvanovoy-Shmygovoy. – Minsk : BGU, 2009. – Vyp. 6. Politicheskoye pole Belarusi glazami diskurs-analitika. – S. 11-29.
26. *Popova, A. V.* Diskurs-kartiny mira i kortezhnogo vzaimodeystviya elitarnykh sredstv informatsii / A. V. Popova. – Minsk : Izd. tsentr BGU, 2008. – 153 s.